**Шымуковіч, Ф.** Афганец / Ф. Шымуковіч // Сцяг працы (Міёры). — 1999. — 31 ліп. — С. 2.

## АФГАНЕЦ

З кожным годам усё далей адыходзяць у гісторыю ваенныя падзеі ў Афганістане, якія прынеслі шмат гора многім сем'ям, страціўшым сыноў, мужоў і бацькоў. А тыя, хто застаўся ў жывых, на ўсё жыццё запомняць свой удзел у той вайне. Сярод іх і прапаршчык запасу Міхаіл Васільевіч Крыўко.

Нарадзіўся ён у суровым 1945 годзе ў Дзісне. З ранняга дзяцінства зведаў розныя цяжкасці. У 1953 закончыў 9 класаў Дзісенскай сярэдняй школы, далей вучыўся ў вячэрняй школе.

У 1964 годзе становіцца салдатам. Спачатку служба праходзіла ў Ленінградскай ваеннай акрузе, а потым накіраваны ў ракетны дывізіён войск супрацьпаветранай абароны.

Адслужыўшы патрэбныя тры гады, у 1967 годзе дэмабілізаваўся і прыехаў на радзіму. Цяжка было знайсці працу па душы ў маленькім гарадку. Ён, як многія юнакі і дзяўчаты, паехаў у Наваполацк, які бурна развіваўся. Прынялі яго на працу на нафтаперапрацоўчы завод. Працаваў машыністам нафтаперагоннай установкі. Аднак адчуваў, што чагосьці не хапае. І ў 1971 годзе па дагавору едзе на працу ў ГДР. Там закончыў школу прапаршчыкаў і атрымаў накіраванне на пасаду старшыны асобай батарэі войск супрацьпаветранай абароны Маскоўскай ваеннай акругі. У 1977 годзе прызначаецца камандзірам узвода гэтай жа батарэі. 1981 год у біяграфіі салдата займае асобны радок. М. В. Крыўко камандзіруюць у абмежаваны кантынгент савецкіх войск у Афганістане. Служыць давялося ў асобным разведвальным батальёне, які ўваходзіў у праслаўленую

201-ю мотастралковую дывізію. Адслужыўшы два гады, а гэта лічылася нормай, зноў пераведзены ў сваю родную часць.

У 1986 годзе служба праходзіла на Украіне. Так павярнуўся лёс, што салдат зноў на вастрыні падзей. Ён прымаў удзел у ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскэй АЭС.

І праз год новае месца службы – у Манголіі. Там быў узнагароджаны медалём гэтай краіны «Баявая садружнасць». І ў 1990 годзе па дасягненню ўзросту звольнены ў запас.

Звычайная біяграфія ваеннага чалввека, калі б не гэтыя два гады ў Афганістане, якія маюць асобы сэнс у жыцці кожнага, хто там быў. Міхаіл Васільевіч з неахвотай успамінае перажытае.

– Гэта была цяжкая вайна, у многім незразумелая для салдат, – гаворыць М. В. Крыўко. – Душманскія фарміраванні знаходзіліся ў звыклых для сябе ўмовах. Горная мясцовасць, тэмпературны рэжым (днём камяні награваліся бы ў печы, а ноччу холадна), рана цямнее, а раніцай хутка віднее. Нашым салдатам асабліва цяжка было пераносіць спёку. Непрывычна і стамляльна лазіць па гарах з поўнай баявой выкладкай.

Некаторыя характарызавалі душманаў проста як бандытаў, Міхаіл Васільевіч з гэтым не пагаджаецца. Так, гэта былі сапраўдныя галаварэзы, для якіх забіць чалавека – звычайная работа. Аднак яны добра падрыхтаваныя прафесіяналы, якія ўмелі аднолькава добра весці бой у горных умовах, у населеных пунктах, днём і ноччу. Адным словам, праціўнік вельмі сур'ёзны. У дадатак узброены сучасным узбраеннем.

Нашы войскі ва ўзбраенні мелі перавагу, але асабовы састаў за выключэннем прапаршчыкаў і афіцэраў не зусім добра ім валодаў. Шасцімесячныя курсы маладога байца не давалі магчымасць дасканала авалодаць зброяй. Гэтыя прабелы камандзірам узводаў і рот даводзілася выпраўляць у баявой абстаноўцы.

– У нашай дывізіі, – адзначае Міхаіл Васільевіч, – добрым камандзірам лічыўся той, хто выконваў задачу і не нёс страт у жывой сіле. Мы павінны былі вярнуць бацькам іх сыноў жывымі.

Смерць юнака ў мірны для краіны перыяд – гэта трагедыя для канкрэтнай сям'і. Але вайна ёсць вайна, і на ёй гінулі людзі. Звесці да мінімуму страты – гэта ўжо ўменне камандзіра.

Інтэнсіўная работа ў войсках праводзілася з сяржантамі. Гэта ж тыя салдаты, на якіх ускладзены абавязкі камандзіраў. Ад іх дзеянняў у час бою залежыла жыццё многіх байцоў.

Баявыя заданні былі розныя: блакіраваць кішлакі, прыкрываць калоны машын на маршы, выбіваць душманаў з кішлакоў, ліквідоўваць акружаныя бандфарміраванні ў гарах, весці разведку.

Міхаіл Васільевіч успамінае, што трэба было ліквідаваць адну варожую групоўку. У яго групе было восем чалавек. Непасрэдная задача – блакіраваць цясніну і не дапусціць прарыву душманаў з акружэння. У той жа час непрыяцель па колькасці пераўзыходзіў нашых воінаў. І праціўнік вырашыў збіць савецкіх салдат з пазіцыі, забяспечыць праход асноўным сілам банды. Тут ужо многае залежыла не толькі ад камандзіра, а і ад дакладнага выканання каманд яго падначаленымі.

– Двое сутак мы не выходзілі з бою, – успамінае Міхаіл Васільевіч. – Выстаялі, выканалі задачу і не страцілі байцоў. Праўда, адзін быў паранены.

Ідучы на любую баявую аперацыю, кожны салдат у Афганістане імкнуўся болей узяць боепрыпасаў. Нават частку ежы пакідалі, бралі гранаты, патроны. Часта ад гэтага залежыла жыццё. І тады салдаты пратрымаліся двое сутак толькі таму, што максімальна, як кажуць, нагрузіліся боепрыпасамі.

Зайшла размова аб узнагародах. Мой субяседнік некалькі хвілін памаўчаў, а потым зазначыў, што ў той абстаноўцы ніхто не думаў аб узнагародах. Галоўнай узнагародай лічылі выкананне задачы і захаванне жыццяў падначаленых. Хаця, зразумела, прыемна, калі цябе адзначаюць за заслугі. Міхаіл Васільевіч гаворыць, што быў прадстаўлены да медаля «За баявыя заслугі», але дакументы недзе згубіліся. Затое атрымаў ордэн «Чырвонай зоркі».

Знаходзячыся на пенсіі, Міхаіл Васільевіч Крыўко вярнуўся ў родную Дзісну, сустрэў добрую жанчыну, пакахалі адзін аднага, стварылі сям'ю. А ці шмат трэба нашаму чалавеку для шчасця? Ён яга заслужыў.

***Ф. Шымуковіч***